— Падчас падзеяў вакол ліцэя сябры Беларускага патрыятычнага саюза моладзі ладзілі ля будынка пікет. Адным з іх лозунгаў быў "Далоў нацыяналізм у адукацыі!". Як бы вы гэта пракаментыравалі?

— Тыя, хто ладзіў пікет, на мой погляд, рабілі гэта па ўказцы, лозунгі ім прадыктавалі пэўныя дарослыя асобы... Нагадаю, што ліцэй дзейнічае цалкам адпаведна з законам аб адукацыі, ягоныя праграмы зацверджаны Міністэрствам адукацыі. Ніякай палітычнай дзейнасці, ніякіх арганізацый з палітычным накірункам, агітацыі ў сценах ліцэя не было, няма ды не будзе. А папракаць за тое, што тут пануе дух павагі да роднай мовы, культуры, гісторыі, — гэта проста нонсэнс!

— Што новага чакаецца ў гэтым навучальным годзе?

— Вялікіх зменаў не адбудзецца, хіба што выкладчыкі далей працуюць над інтэграцыяй гуманітарных дысцыплін. Ужо некалькі год літаратура, напрыклад, выкладаецца адзіным прадметам, гэта значыць — няма штучнага падзелу на рускую, беларускую, сусветную... Цяпер мы ідзем да таго, каб зрабіць адзіным прадметам гісторыю. Усё гэта дазволіць вучням мець больш сістэматычныя веды. Імкнемся інтэграваць, хаця зрабіць гэта больш складана, і негуманітарныя прадметы — хімію, фізіку, біялогію.

Словам, у сценах ліцэя ўзяты накірунак на глыбокія і трывалыя веды, выхаванне інтэлігентных і высокаадукаваных маладых людзей, якія здолеюць потым плённа працаваць на карысць Бацькаўшчыны. Вось толькі б не ладзілі нам новых перашкод...

Гутарыла Вольга КЛАСКОЎСКАЯ.

Уражанні

Дыялог паміж мужчынамі і жанчынамі ў еўрапейскім маштабе

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Гэта даказвае, што нельга дасягнуць сапраўднай роўнасці, ігнаруючы закон і правы чалавека.

У многіх краінах існуе Закон аб роўнасці палоў, які юрыдычнай мовай замацоўвае нормы і стандарты грамадзкага жыцця. Тут роўнасць разглядаецца як роўныя магчымасці ў працы, у палітыцы, у культурным і духоўным жыцці. А клопат аб сям'і і выхаванні дзяцей ужо не з'яўляецца толькі жаночай справай. Вырашэнне гэтых праблем знаходзіцца на ўзроўні дзяржаўнай палітыкі, бо калі роўнасць зрабіць толькі прыватным пытаннем, то будуць выпушчаны з-пад увагі многія праблемы. Другая справа — прыватны выбар — на кухню альбо ў парламент. Роля дзяржавы — стварыць умовы і ліквідаваць перашкоды для рэалізацыі выбару.

Таму так цікава было даведацца аб станоўчым вопыце паўночнаеўрапейскіх краін, дзе палітыка раўнапраў'я не абмяжоўваецца заканадаўствам. У паўночных краінах уведзены інстытут Омбудсмена (раўнапраў'я) — наглядальніка за выкананнем закона аб роўнасці, які мае нават больш высокія правы, чым суд. Омбудсмен сочыць за роўным прадстаўніцтвам у выбарнай сферы, разглядае факты дыскрымінацыі ў прадпрыемствах і прыватным жыцці. Закон аб роўнасці мае нейтральны характар да палоў. Але, па дадзеным Омбудсмена, на парушэнне Закона аб роўнасці 80 працэнтаў скаргаў паступае ад жанчын і толькі 20 працэнтаў — ад мужчын.

Зараз у многіх еўрапейскіх краінах існуюць міністэрствы раўнапраў'я. Раўнапраў'е заўсёды адзначае развіццё. Гэта імкненне палепшыць жыццё грамадства. Аднак нават маючы закон аб раўнапраў'і, трэба навучыцца ім карыстацца. Бо рэальнае жыццё часта адстае ад закона.

Асновай няроўнасці, як было падкрэслена на канферэнцыі, з'яўляецца традыцыйны падзел палавых роляў. Таму вельмі важна адукоўваць грамадства па пытаннях роўнасці, тлумачыць эканамічныя і палітычныя, прававыя, сямейныя, [illegible] канкрэтныя працоўныя праграмы рэалізацыі раўнапраў'я. Адна з важнейшых задач — стварыць умовы для таго, каб жанчына была канкурэнтаздольнай на рынку працы, у палітыцы і ў іншых сферах.

Цікавыя дыскусіі аб уплыву падзела сацыяльных роляў адбыліся на паседжаннях, прысвечаных сродкам масавай інфармацыі. Тут прадстаўнікі паўночных і балтыйскіх краін былі аднадушнымі — СМІ неадэкватна адлюстроўваюць жыццё і праблемы жанчын, а часам падаюць іх у скажоным выглядзе. Гэтае заключэнне было падтверджана мноствам даследаванняў і цікавых назіранняў. Напрыклад, даследчыкі сцвярджаюць, што 80 працэнтаў навін асвятляюць праблемы мужчын. Нават многія жанчыны- журналісты лічаць праблемы жанчын другаснымі і што гэта тэма не дасць ім поспех і шлях да кар'еры. Нажаль, і прыватызацыя СМІ не дала станоўчых змен з асвятленнем праблем жанчын.

Вялікая ўвага на канферэнцыі была прыцягнута да тэмы насілля. Было важна даведацца, што ў паўночных краінах насілле, прыніжэнне жанчын не прызнаецца ўжо грамадствам ні ў якай форме. У гэтых краінах ёсць і заканадаўчая база, ёсць канкрэтныя структуры (прыбежышчы для пацярпелых, крызісныя цэнтры, "гарачыя" тэлефонныя лініі), у гэтых працэсах удзельнічаюць суды і паліцыя. Вялікая роля там надаецца псіхалагічным службам і адукацыі.

Праблемы сямейнага насілля, сексуальнага дамагацельства, раней скрытыя ад грамадства, сталі тэмай вывучэння і абмеркавання. Намаганні грамадства далі вынікі — існуе пакаранне, есць сродкі абароны, таму маштабы праяў насілля ў паўночна-еўрапейскіх краінах значна зменшыліся.

У адрозненні ад Беларусі балтыйскія краіны зараз таксама робяць шмат намаганняў, каб зменшыць вастрыню праблем насілля — удасканальваецца заканадаўства, адчынены першыя прыюты для пацярпелых ад насілля.

У нашай жа краіне толькі жаночыя арганізацыі імкнуцца прыцягнуць увагу грамадства да праблем насілля над жанчынамі, а ўладу, для якой насілле — гэта інструмент кіравання — гэтыя пытанні не цікавяць.

Набольш вострымі, асабліва з боку балтыйскіх краін, былі абмеркаванні эканамічнай сітуацыі, фемінізацыі, беднасці. Было заяўлена, што калі ўдасца вырашыць праблему беднасці жанчын, то ў цэлым будзе пакончана з галечай у свеце.

Лейтматывам канферэнцыі быў пошук дыялогу, аб'яднанне намаганняў двух палоў у вырашэнні ўсіх праблем. Дыялог пачаўся, нягледзячы на тое, што на канферэнцыі прысутнічала толькі 20 працэнтаў мужчын (хаця пры запрашэнні вытрымлівалі парытэт). Пакуль узгаданыя праблемы больш хвалююць жанчын. Але жанчыны і мужчыны шукаюць задавальненне і ў сваёй працы, і ў прыватным жыцці, яны мусяць жыць і працаваць разам, а не супрацьстаяць. Таму дыялог паміж мужчынамі і жанчынамі не толькі неабходны, ён цікавы і карысны.

Демократия по-белорусски

...И в Витебске расправились с НТВ

В первых числах апреля нынешнего года местные газеты сообщили читателям Витебска приятную новость: в городе начинает работать новый, 26-й, канал, по которому будут транслироваться программы НТВ. Горожане, не очень-то избалованные живым словом с экрана, были приятно удивлены таким подарком и целый месяц буквально упивались лицезрением программ самой рейтинговой телекомпании России.

Увы, праздник у зрителя закончился после того, как "энтэвэшники" пустили в эфир памятный сюжет "Кукол" с белорусским президентом в главной роли. В один прекрасный день, а вернее вечер, зрители на своих экранах вместо яркой картинки НТВ увидели на 26-м канале заставку невесть откуда взявшейся компании СТС. В утренние и дневные часы 26-й канал продолжал вещание НТВ, но в вечерние часы эфир канала заполнял ширпотреб такого уровня, от которого зрители уже поотвыкли.

Как и следовало ожидать, местные журналисты потребовали от руководителей Витебского телерадиообъединения (ТРО) объяснений, что случилось, почему вечером исчезла с экранов картинка НТВ? Однако председатель ТРО В.Мальчиков оказался "тертым калачом": никаких интервью, никаких объяснений.

И лишь спустя почти три месяца руководители ТРО, видя, что жители областного центра не собираются мириться с "рокировкой" НТВ на СТС, решились-таки нарушить "обет молчания". Сам В.Мальчиков, впрочем, отказался быть героем газетной публикации, доверив это дело своему заместителю А.Семерневу. Из этого интервью, данного городской газете "Витьбичи", жители города узнали вдруг поразительные вещи.

Оказалось, во-первых, что в апреле местные газеты дезинформировали читателей, сообщив о регулярной трансляции НТВ по 26-му каналу. Что доводить до витебского зрителя программы НТВ никто и не собирался. А то, что эта телекомпания целый месяц транслировалась в городе на Двине, — это не более чем досадное недоразумение.

А во-вторых, целью открытия 26-го канала было развитие собственного, витебского телевидения. И открылся канал не на деньги налогоплательщиков, а "на собственные деньги, собранные телерадиообъединением".

По словам А.Семернева, необходимо было, чтобы "Витебское телерадиообъединение могло работать в эфире, размещая свои передачи в самое удобное вечернее время, больше уделяя внимания городской тематике". А поскольку в силу объективных трудностей ТРО не в состоянии занять весь эфир, был заключен договор с "перспективной московской телекомпанией СТС (сеть телевизионных станций), обладающей прекрасными техническими возможностями".

Если верить словам руководителей Витебского ТРО, они пытались заключить подобный договор с НТВ и даже с ТВ-6, однако эти компании якобы отказались транслировать свои программы в купированном виде.

Итак, с точки зрения витебских телевизионщиков, все обстоит очень просто: ТРО приобрело за собственные деньги передатчик, лицензию на вещание, создало коммерческий канал. Соответственно, обладая правом собственника, владельцы канала вправе сами решать, как использовать эфирное время. Логично? На первый взгляд вполне. Если бы не несколько "но"...

Начнем с главного, то есть с приобретения телерадиообъединением передатчика и лицензии на вещание. Из уст руководителей ТРО приходилось слышать две версии происхождения этих денег. Первая: использованы средства трудового коллектива. Вторая: затрачены деньги, полученные от ведения коммерческой деятельности.

При осуществлении первого варианта к владельцам канала действительно не могло бы быть никаких претензий. Но... Во-первых, о своей причастности к каналу многие сотрудники ТРО услышали впервые тогда, когда в городе развернулась дискуссия по НТВ. И потом, что-то не очень верится, чтобы в наше непростое время люди добровольно вкладывали деньги в создание нового телевизионного канала. Тем более что, задействуя на канале компанию СТС плюс местное телевидение, ни о каких дивидендах не может быть и речи — ни один уважающий себя бизнесмен-рекламодатель никогда не будет вкладывать деньги в столь сомнительное предприятие.

Еще один вариант происхождения средств для открытия телеканала — собственная коммерческая деятельность ТРО. Увы, опять не стыкуется. Прежде всего деньги, заработанные с использованием государственного имущества, едва ли можно считать личным доходом, на который открывается собственное дело. И потом, на той рекламе, что проходила на витебском телевидении, на передатчик не заработаешь. А других способов зарабатывания денег для телевизионщиков областного масштаба, как известно, просто не существует. Не семечками же на базаре, в конце концов, они торговали!

Нельзя при этом не учитывать и тот факт, что сами телевизионщики, мягко говоря, не купаются в роскоши, что зачастую у них нет даже возможности отправить на "горячую" тему съемочную группу — нет бензина для автомобиля. Попробуй, собери в этих условиях тысячи долларов! Как там ни крути, передатчик — это не авторучка, между прочим, заодно с другими вещами не купишь!

А теперь — относительно утверждения А.Семернева о том, что Витебское ТРО собирается работать в эфире, "размещая свои передачи в самое удобное вечернее время, больше уделяя внимания городской тематике".

Отнюдь не желая обидеть коллег-телевизионщиков, скажу, что в творческом плане Витебское телерадиообъединение переживает сейчас, мягко говоря, не самые лучшие времена. А если говорить проще — за последние месяцы журналисты ТРО просто-напросто ничего не сделали. За исключением коротких выпусков новостей и репортажей с крупнейших культурных событий типа фестиваля "Славянский базар".

Вечерний блок НТВ прекратил свое существование в Витебске в первой декаде мая. Это время можно считать началом работы "коммерческого" канала Витебского ТРО. Что же предлагали зрителю коммерсанты от ТРО?

Первые недели жителей Витебска баловали фондовыми передачами типа "Рандеву со звездой" на "Славянском базаре" или "Сокровища витебских музеев". Позже с 26-го канала исчезло все, кроме пресловутой "Банки комиксов" да музыкальных поздравлений "Желаю вам...". Так где же "работа в эфире", где же "городская тематика"?

Подобная "коммерческая" деятельность более всего свидетельствует о... страстном желании разориться. А как иначе можно оценивать тот факт, что Витебское ТРО, ежемесячно уплачивая за канал около 20 миллионов рублей (аренда плюс плата за частоту), абсолютно ничего не делает, чтобы восместить затраты? Непонятная, согласитесь, коммерция.

Осмелюсь высказать предположение, буквально лежащее на поверхности: Витебское ТРО никогда и не стремилось работать на 26-м канале. Надо было убрать нелицеприятную для властей публицистику НТВ — вот и была изобретена история с "развитием местного телевидения". Не в коммерческих, не в творческих вопросах дело — сквозь шитое белыми нитками худое покрывало, наброшенное на НТВ, явно просвечивает большая политика.

А теперь — о двух ответах относительно закрытия в Витебске блока вечернего вещания НТВ. Первый — от заместителя технического директора компании НТВ В.Михайлова. Автор факса, утверждая, что "телекомпания заинтересованного в трансляции в эфир своей программы в г.Витебск в полном объеме", вместе с тем подчеркивает, что "положительное решение вопроса от нас не зависит", решать это надо с собственником передатчика 26 ТВК — областным телерадиообъединением, "предложений от которого мы не получали".

Второе письмо подписал заместитель председателя Белтелерадиокомпании В.Куприенко. Прежде всего автор поспешил открыться от двусмысленной ситуации с 26-м каналом: "...решение вопросов не зависит от национальной государственной телерадиокомпании..." По поводу виновника этой истории В.Куприенко добавляет: "Вещательные приемники находятся в распоряжении Министерства связи, вопросы, на каком канале и кому работать, решает республиканская комиссия по распоряжению частот".

Так вот где, оказывается, главный виновник! А мы-то думали...

В заключение В.Куприенко цинично предлагает несколько выходов:

"первый — индивидуальная спутниковая антенна;

второй — расширение городской кабельной сети;

третий — поиск средств для приобретения передатчика".

А тем временем борьба за возвращение НТВ потихоньку сходит на нет — круговая порука чиновников настолько запутала ситуацию, что вообще стало непонятно, кто и в чем виноват. И рядовые жители Витебска, придя вечером с работы, все так же игнорируют некогда заветный канал, по которому под заставкой "СТС" транслируются мыльные оперы того уровня, глядя на которые "Девушка по имени Судьба" воспринимается как шедевр мирового кинематографа. Ни о какой публицистике и речи нет...

P.S. *Сегодня, когда идет массированная атака на все российские электронные СМИ, начиная с ОРТ, говорить о закрытии НТВ на витебском телеканале как-то вроде бы и не пристало. Однако это "ЧП областного масштаба" так же может послужить свидетельством тому, что диктаторскому режиму ни к чему живое слово журналиста.*

Евгений ТОМОВ.

Витебск.

Народная Воля
4 ВЕРАСНЯ 1997 г.

Дайджест

В Каннах большинство бутиков обзавелись русскими вывесками

Несмотря на экономический кризис, туризм во Франции процветает, пишет "Крисчиан Сайенс Монитор". Страна вновь вышла на первое место среди самых посещаемых туристами стран мира. По мнению газеты, основными причинами привлекательности для туристов Франции стали рост курса доллара относительно местного франка, чистота гостиничных номеров, а также то, что все больше французов, несмотря на усилия Французской Академии, начинают говорить по-английски. Однако французское Средиземноморье теряет привлекательность для туристов, приезжающих из Великобритании и Соединенных Штатов, которые предпочитают Бретань с ее еще нетронутыми цивилизацией пейзажами, отмечает газета. Ривьера же с ее высокими ценами, толпами отдыхающих, плохой едой и ультраправыми мэрами привлекает в основном российских туристов. Нуворициии из России стали настолько многочисленными в Каннах, Ницце и Монако, что большинство местных бутиков обзавелось русскими вывесками. А в вагонах первого класса поездов Париж-Канны красивая девушка комментирует достопримечательности для пассажиров на чистом русском, пишет "Крисчиан Сайенс Монитор".

...Никто и не подумал, что красавица была слепая

Когда-то банальный и старомодный конкурс красоты "Мисс Италия" в этом году вызвал полемику в прессе, пишет британская "Таймс". Как оказалось, среди участниц конкурса, который пройдет 6 сентября, будут полностью слепая девушка, цыганка, занимавшаяся попрошайничеством, и две пары близняшек. Фаворитом журналистов стала 20-летняя Аннализа Минетти из Милана. Несмотря на слепоту, сеньорита Минетти участвовала в нескольких конкурсах красоты, причем никто и не подумал, что красавица была слепая. После победы в конкурсе "Мисс Ломбардия", давшей ей путевку на конкурс "Мисс Италия", сеньорита раскрыла свою тайну. Оказалось, что во время выступления приятель сеньориты Минетти Паоло передавал ей команды с помощью радиоприемника, спрятанного в ухе девушки. Как отмечает "Таймс", нынешний конкурс "Мисс Италия" станет не менее интересным, чем предыдущий, в котором победила 19-летняя Дениз Мендес, родившаяся в Доминиканской Республике.

Не те пошли солдаты. Чтобы укрепить их здоровье, нужно начинать с аэробики

Времена лающих сержантов и изнуряющих тестов на выносливость в британской армии закончились, пишет "Таймс". Испытывая тревогу из-за сокращения числа новобранцев и осознавая, что сегодняшний подросток находится далеко не в такой физической форме, как его ровесники из предыдущих поколений, командование британской армии приняло решение пересмотреть программу начальной подготовки солдат. По информации газеты, новая программа, которая будет оглашена 27 августа, значительно снижает требования к новобранцу и предусматривает более постепенное достижение им физической выносливости профессионального солдата. Новая программа даже не требует от новобранцев обязательных кроссов на выносливость и оставляет возможность начинать подготовку с аэробики. Кроме того, отныне требования к подготовке солдат будут зависеть от их должности: от военного клерка более не будет требоваться выносливость бойца с передовой. По оценкам авторов программы, с ее принятием количество новобранцев, прошедших начальную подготовку, возрастет на 16 процентов, пишет "Таймс".

Подготовила Светлана РОСТОВА.

Мюнхен — Мінск

Ніна МІХАЙЛАВА

Мне такое і не снілася...

Пра тое, што калі-небудзь пабываю за мяжой, я перастала і марыць. Але вось з Божай дапамогай трапіла ажно на месяц у горад Мюнхен. Для мяне ўсё там было незвычайным і цікавым, і таму запісвала, як кажуць, па прынцыпу: што бачу, тое і пішу.

Від на цэнтр горада. Сабор Фраўэнкірхе. Башня "Стары Петэр". Старая ратуша. Алімпійская башня.

* * *

Прыехала ў Мюнхен 14 студзеня, якраз на стары Новы год. Крыху больш як два тыдні назад немцы святкавалі Нараджэнне Хрыстова, і таму я адразу заўважыла ў дварах упрыгожаныя гірляндамі лямпачак елачкі або любое дрэўца. На падаконніках ляжалі яловыя лапкі, прыгожыя вянкі са штучных кветак, стаялі свечкі, розныя дзіцячыя цацкі. Прычым усё гэта знадворку. Вянкамі з яловых лапак упрыгожаны брамкі ля нешысокіх жылых дамоў. Карацей кажучы, усё тут нагадвала пра нядаўняе вялікае свята.

Мюнхен — сталіца Баварыі, тут жывуць вельмі веруючыя людзі. Нават замест звыклага "Guten Tag!" тут усюды — у магазіне, у пад'ездзе, у транспарце, дома — вдзень аднаму кажуць "Grüs Gott!" (даслоўна: "Вітаю Богам!").

Мюнхенскі галоўны вакзал (Hauptbahnhof) вельмі вялікі. Гэта вялікая пабудова на зямлі і пад зямлёй. Пад зямлёй ажно тры паверхі. Калі пачаць знізу, то на самай глыбіні знаходзяцца лініі метро U-1 і U-2 (скарочана — ад Untergrundbahn, потым над гэтымі лініямі — U-4 і U-5, затым — "эсбаны" (электрычкі). Зноў на эскалатар — і аказваешся (як у нас) у цокальным памяшканні. Гэта сапраўдны горад пад зямлёй: сувенірныя, прадуктовыя, кніжныя лаўкі, розныя паслугі з маляўнічай рэкламай.

Яшчэ разок на эскалатар — і апынешся на Erdgeschoß (літаральна: "наверх на зямлі". Дарэчы, у немцаў першым паверхам лічыцца паверх над Erdgeschoß.

Што мяне адразу здзівіла, як трапіла ў вялізны будынак вакзала, дык гэта вялізны-вялізны, у форме авала прылавак, на якім ляжалі і песцілі вока самыя розныя прыгожыя цукеркі. Даўжыня прылаўка, як падалося, ля 50 метраў. Пакупнікі з двух бакоў ходзяць і самі сабе насыпаюць у кулькі прысмакі. (Дарэчы, на кожны від слодычы цана аднолькавая.) Ну, думаю, нічога сабе! Які давер пакупніку! А прадавец з электроннымі шалямі сядзіць у самым канцы прылаўка і не баіцца, што хто-небудзь не расплаціцца. Ды такога і не здарыцца! Настолькі тут высокая ўнутраная культура. І прыезджы чалавек гэта адчувае адразу.

Далей ідзеш і зноў не перастаеш здзіўляцца. Вось "камера хавання". Памяшканне ад залы чакання аддзелена лёгкай сеткай, гэта нават не дзверы. Падыходзіш бліжэй, сетка падымаецца аўтаматычна ўверх, перад табою з'яўляецца чалавек, які тут працуе. Чуеш ужо знаёмае: "Grüs Gott", на твары — "Ich bin Ihnen zu Diensten". Адразу ж — "Was kann ich für Sie tun?" Ляць па горадзе, калі дазваляе час. Рэчы будуць у поўнай захаванасці. Тут няма ніякіх аб'яў тыпу: "За ценные вещи администрация ответственности не несет", "За вещи, не закрытые на замок, администрация ответственности не несет". Упершыню ў Мюнхене я падумала, што такія безадказныя аб'явы і даюць магчымасць не захаваць здадзеныя рэчы. Узнікае пытанне: для чаго ты тут працуеш, калі што-небудзь можа прапасці?

Дарэчы, у горадзе ўсюды стаяць машыны, днююць і начуюць ля тратуараў, у дварах; стаяць на спецыяльных стаянках веласіпеды ля пад'ездаў, ля магазінаў. І ніхто не падумае ўкрасці, ніхто не спрабуе зняць колы, шчоткі з лабавога шкла. З акна кватэры, дзе жыла, угледзела на даху машын снег, (відаць, даўно стаяць), дык і спытала ў гаспадара:

— Няўжо ніхто не спакусіцца зняць кола, залезці ў салон?

— Што вы! — пачула ў адказ, — нікому і ў галаву такое не стукне. Калі хто-небудзь зачэпіць чужое, то яму пагражае вельмі вялікі штраф, а то і турма. Не ты паставіў, паклаў, не ты і бярэш. Ганьба і ад людзей таксама.

Праўда, за ўвесь месяц я бачыла два веласіпеды са знятымі коламі. Мне растлумачылі, што хутчэй за ўсё такое маглі зрабіць рускія.

Жыла я ў трох прыпынках ад Галоўнага вакзала. Мой гаспадар — гасцінны і ветлівы чалавек, беларус з Клецка Дзмітрый Мікалаевіч Чайкоўскі — здымае двухспальную кватэру на другім паверсе (у немцаў гэта першы паверх). У кватэры дзве спальні па 18 кв. м, гасцінная — 22 кв. м, вялікая прасторная прыхожая, ванны пакой разам з санвузлом (дарэчы, таксама прасторны) і невялікая прадаўгаватая кухня.

Гаспадар мне патлумачыў адразу, што спальныя пакоі не апяляюцца, таму снедаць, палуднаваць, вячэраць і бавіць час мы будзем у гасцінай. Справа ў тым, што толькі там стаяў вялікі сучасны абагравальнік, з дапамогай якога ў зале падтрымлівалася тэмпература +18° С. Ну, падумала, адразу захварэю і будзе мне ўсё. Ажно не! Пад сапраўднай пуховай коўдрай і пледам спаць было здорава і цёпла.

Дзмітрый Мікалаевіч вельмі любіць зялёны колер, таму на падлозе пакрыццё зялёнае, канапа з двума крэсламі ў салатавых танах. Ля вялізнага акна стаяць пакаёвыя кветкі: пальма, бярозка. Дарэчы, апошняя вельмі ж нагадвае лісточкамі сапраўдную беларускую бярозку. Акно выходзіць на даволі ажыўленую вуліцу Tengstraße, і машыны снуюць туды-сюды, пры гэтым у пакоі амаль не чутно шуму. Выказваю гаспадару сваё здзіўленне, на што ён мне адказвае:

— Тут стаяць спецыяльныя шуманепранікальныя шыбы.

На сценах гэтага пакоя (дарэчы, як і ў спальнях) вісяць карціны, выкананыя таленавітымі рукамі Дзмітрыя Мікалаевіча. Спыняю свой позірк на партрэце Янкі Купалы — самым любімым і дарагім паэце для яго. Дзмітрый Мікалаевіч заўважае:

— Нарэшце адзін вельмі добры беларускі хлапец перадаў гэты партрэт для Літаратурнага музея Я.Купалы ў Мінску. Я гэтым ганаруся.

Я ўбачыла, як засвяціліся радасцю і ўдзячнасцю вочы майго гаспадара, чалавека ўжо, скажам так, немаладога веку (ён 1912 года нараджэння).

Адна сцяна ўвешана сувенірамі. Яны самыя розныя — беларускія драўляныя лыжкі, кухонныя дошкі ў нацыянальным стылі, ручнікі. На самым пачэсным месцы беларускі нацыянальна-гістарычны герб "Пагоня", бел-чырвона-белы сцяжок. Другая сцяна ў фатаграфіях, зробленых сынам Анатолієм у час паездкі на радзіму ў Клецк, што на Мінчыне.

Падораныя мною кухонныя дошкі спадар Чайкоўскі прымацаваў над рабочым сталом на кухні, а беларускі ручнік, які я таксама яму прывезла, ён, пацалаваўшы, павесіў на абраз Казанскай Божай маці.

Агледзеўшыся трохі ў кватэры і даведаўшыся, што спадар жыве тут адзін, я пацікавілася, у колькі марак яна абыходзіцца яму ў месяц. Аказалася, што 1500. Праўда, ёсць ільготы, але яны нязначныя.

Як стала вядома пазней, мой спадар ладную суму ў год аддае за вучобу сваёй унучкі. Карацей кажучы, расходы не малыя, калі ўлічыць, што ёсць яшчэ машына, гараж; ладна грошай расходуецца на ежу. Тым не менш на ўсё хапае, каб жыць бязбедна. Праўда, я палічыла нетактоўным спытацца пра памер пенсіі. Але ўсё і так зразумела.

Давялося мне пагасцяваць яшчэ ў адной пенсіянеркі. Зараз яна здымае аднаспальную кватэру (двухпакаёвую па-нашаму) у цудоўным прыгарадным раёне. Уся жылая плошча прыкладна 35 кв. м. Адзін пакой на 15 кв. м, другі — на 10, астатнія метры прыпадаюць на кухню, прыхожую і ванны пакой. Раскошы вялікай не бачна, але ўсё з густам і прыгожа.

А якая чысціня ў пад'ездзе! Сходкі выслены пакрышцём для падлогі. Ды не проста выслены, зубамі выразана ля кожнай сходкі. Ідзеш на абцасах, і ніякага грукату. Ніхто чужы сюды без дай прычыны не зойдзе. А калі ідзеш у госці, то націскаеш кнопку з патрэбным прозвішчам, і, не выходзячы з кватэры, табе адчыняць дзверы.

Домікі ў прыгарадзе трохпавярховыя, амаль усе размаляваныя. На балконах, на стрэхах растуць вельмі прыгожыя вечнязялёныя расліны. Ля пад'ездаў і вакол домікаў акуратна падстрыжаныя кусцікі. Яны служаць як бы агароджай для кветнікаў. Кажуць, што вясной, летам і восенню ад зеляніны і кветак вачэй не адвесці.

А як хораша глядзяцца вокны ў гэтых доміках і ўвогуле ва ўсёй Германіі! Прыгажосць стварацоць розная формы, колеру фіранкі.

Наша гаспадыня аказалася вельмі гутарлівай. Безупынку панямецку гаварыла пра мужа (ужо амаль два гады, як ён памёр), пра чатырох сваіх дзяцей, якіх яна гадавала, можна сказаць, адна і таму ніколі не працавала. Найбольш яна распавядала пра мужа (ён беларус), што ён да фанатызму быў запалітызаваны, вельмі перажываў за сваю Бацькаўшчыну, а гэта адмоўна адбівалася на ягоным здароўі.

Пасля яе аповеду я доўга не магла заснуць, думала пра лёс гэтага чалавека, які, па словах гэтай жанчыны, не адыходзіў ад радыёпрыёмніка, ад "тэлевізіі" і ўсё думаў пра Беларусь. А ягонае вялікае сэрца беларускае не магло іначай, яно шчымела, балела за Беларусь, за беларускі народ. У гэтай сувязі прыйшлі на памяць словы Генадзя Бураўкіна:

А я і ў радасці, і ў скрусе,
І калі сцішуся ў труне,
Сніць буду сны аб Беларусі,
Маёй радзімай старане.

* * *

Двойчы за ўвесь час я пабывала ў Альпах. Мой гасцінны гаспадар прапанаваў з'ездзіць у баварскую вёску Обераммэргау (гук "г" — узрыўны). Але ўгледзеўшы, што ў мяне на галаве вялікая квяцістая хустка, ён дастаў з шафы шапку і сказаў:

— Гэта будзе па-нямецку, і якраз пасуе да вашага каўняра.

Мусіць, пабачыў, што мая паўлапасадская хустка вельмі выдзяляецца на фоне еўрапейскіх жаночых галоў. Ну што ж, Еўропа ёсць Еўропа, падумала я, і з вялікай прыемнасцю надзела на галаву падарунак і так адправілася ў Альпы.

І вось тут мне хочацца расказаць больш падрабязна. Прыняўшы запрашэнне, я сказала Дзмітрыю Мікалаевічу, што паездка для нас вялікая раскоша, а для вас, канешне ж, да таго і будзе вельмі дорага каштаваць. На што пачула ў адказ, што гаспадар ужо больш як два тыдні нікуды не выязджаў на прыроду за горад (я падрабязней аб горадзе, бо ён рэд., а то і два на дзень катаецца на веласіпедзе ў Алімпійскім парку), а таму і сам з задавальненнем адпачне крыху ад гаралской мітусні, падыхае свежым паветрам.

Хачу сказаць пра ўзрост нашага праваднніка (ён жа і вадзіцель легкавой машыны). Спадару Дзмітрыю даўно за 80.

Да месца, куды мы накіроўваемся, 86 кіламетраў. Спачатку едзем праз горад. Міма маёй увагі не праходзіць тое, як паводзяць сябе на дарозе ў горадзе вадзіцелі — узаемная павага, дысцыпліна, усмешкі адзін аднаму. Машына ідзе плаўна, пастаў стакан вады — не разальецца.

Выязджаем на MittelRing (сярэдняе кальцо) і — на аўтабан. Толькі і паспяваю глядзець за спідометрам, які менш як 130 км у гадзіну не паказвае. А за рулём чалавек, якому далёка за 80!

Мільгаюць за акном роўныя квадраты снежных палёў з рознымі пабудовамі: можа, хлявы для сена ці яшчэ што. У далечыні ад дарогі — акуратныя домікі. Думаецца, што там жывуць фермеры, бо ў некалькіх месцах бачылі да дзесятка чыстых, прыгожых і адкормленых коней.

Але больш за ўсё паабапал дарогі лес, у асноўным яловы, трапляліся і сосны. Трэба адзначыць, што нямецкія елкі крыху адрозніваюцца ад нашых беларускіх. Галіны ў нашых разлеглыя, снег на іх ляжыць шапкаю. А тут жа, асабліва ў Баварыі, як быццам глядзяць угору, а лапкі звісаюць так, нібы да асноўнага ствала прышыты з двух бакоў махры. Сёння гэтыя лапкі пакрыты інеем. Божа мой мілы! Да чаго ж гэта прыгожа!

Дарога паступова падымаецца ўгару, і ўдалечыні спачатку бачны невысокія Альпы. У 20—30 метрах ад дарогі віднеецца сетка накшталт нашай Рабіцы. Гэта для таго, каб лясныя жывёлы не выскоквалі на праезджую частку.

Аўтабан скончыўся, і мы звярнулі ўправа на горную дарогу, вельмі вузкую, здавалася, што скалы вось-вось заступяць дарогу, але не трэба баяцца. Дзе скалы вельмі навісаюць над дарогай, там яны абцягнуты засцерагальнай сеткай. У многіх месцах спецыяльна абсечаны, дзе-нідзе паўзрываны. Гэта для таго, каб засцерагчы дарогу ад апоўзняў.

Дарога тут вельмі вузкая, крутая, з рэзкімі паваротамі. На такіх участках вадзіцелі надзвычай узаемаветлівыя, строга трымаюцца свайго боку, не перавышаюць дазволенай хуткасці.

Нарэшце прыехалі да месца адпачынку. У гэтай вёсцы вельмі вузкія вулачкі, машыны размінаюцца з вялікай цяжкасцю. Домікі аднапавярховыя, размаляваныя. Тэмы малюнкаў самыя розныя — баварскія казкі, біблейскія сюжэты. Знадворку вокны ўпрыгожаны яловымі лапкамі, сухімі кветкамі, гараць лямпачкі. На многіх доміках крыжы з распяццем Хрыста.

У цэнтры вёскі на Erdgeschoß (этаж на зямлі) знаходзіцца невялікія гандлёвыя лаўкі. Гэта яны тут лічацца невялікімі. А калі глядзець вачамі прыезджага чалавека, як я, то некаторыя лаўкі па плошчы ў два разы большыя, чым прадуктовы магазін, скажам, на вуліцы Карастаяновай у Мінску. А якая колькасць тавараў! Яны раскладзены і далёка за межамі лаўкі на вуліцы: падыходзь, выбірай, нясі ў лаўку і аплачвай. Ніхто не падумае ўзяць і не заплаціць. Вырабы па дрэву, з гліны, сурвэткі, посуд, адзенне, сувеніры, штучныя кветкі, свечкі! Ад усяго не адвесці вачэй. Мы трапілі якраз тады, калі ва ўсіх лаўках быў абедзенны перапынак. Гаспадары толькі прычынілі дзверы, а тавары астатнія так і ляжаць на вуліцы.

Ля адной лаўкі мы спыніліся. Дакладней, нас спыніў так званы зазывала. А выглядаў ён прыкладна так: на электрычную лямпачку накінута прыгожая вышываная сурвэтка; зверху — прымацавана фігурка з кардону ў выглядзе чалавечка з паднятай рукой. Калі набліжаешся да лаўкі, то спрацоўвае нейкі механізм, фігурка пачынае падскокваць і махаць рукою ў бок дзвярэй: маўляў, заходзь, выбірай, што душа пажадае. Прытым усё гэта суправаджаецца жаласнаватазапрашальнай мелодыяй, якая напомніла мне беларускую жалейку.

А прадаваліся тут баварскія сувеніры — паштоўкі, часопісы, розныя фігуркі, баварскія шляпы. Патрымала адну, з пяром, у руках. Вось, думаю, няблага было б прывезці свайму гаспадару ў Мінск, на баварца стане падобным. Але не! Цана ў 69 марак астудзіла маё памкненне.

Перад ад'ездам вырашылі зазірнуць у кафэ-рэстаран, выпіць гарбаты. Урачыстая цішыня. Зала амаль пустая. Занялі апошняе месца ў куце, каб зручней было ўсё агледзець. Побач з намі яшчэ чацвёра за такім жа столікам. Столікі пакрыты далікатнымі ружовымі абрусамі, на кожным свечка, а над сталом звісае прыгожая лямпа пад абажурам у тон абрусу.

Падыходзіць афіцыянт, з усмешкай гаворыць "Grüs Gott" і бярэ ў нас заказы: дзве гарбаты з лімонам, адну з манга і па порцыі кухані. З такой жа ўсмешкай herr Ober прыносіць заказанае, запальвае свечку і жадае добрага апетыту. На ўсё кафэ абслугі ўсяго два чалавекі. Відаць, гэта брат і сястра, бо дужа ж яны падобныя.

(Заканчэнне на 4-й стар.)

Калона Марыі перад ратушай. На заднім плане — башні сабора Фраўэнкірхе.

Самолет, который не нравится даже Биллу Клинтону

Похожий на гигантскую летучую мышь американский бомбардировщик Б-2, изготовляющийся с использованием технологии "Стелс", не только остается видимым в полете для радаров противника, но и очень чувствителен к температуре и влажности воздуха, пишет "Сан-Диего Юнион-Трибьюн". По этой причине Соединенные Штаты не могут их разместить, как планировалось, в Европе до постройки там специальных ангаров с контролем микроклимата. Постройка же ангаров еще больше увеличит стоимость бомбардировщика, уже достигающую двух миллиардов долларов. Согласно докладу, подготовленному Управлением общей бухгалтерской отчетности, антирадарное покрытие бомбардировщиков Б-2 настолько чувствительно к влажности воздуха и тяжелым климатическим условиям, что, по мнению экспертов, единственной возможностью успешной эксплуатации самолетов будет постройка специальных ангаров. Кроме того, избыточная влажность воздуха может вывести из строя ряд систем самолета, что потребует, по крайней мере, сутки для его полного осушения. Президент Билл Клинтон уже пригрозил законодателям, что наложит вето на любой закон, одобряющий дополнительные расходы на Б-2, пишет "Сан-Диего Юнион-Трибьюн".

Власти Непала решили убрать трупы альпинистов с горы Эверест

"Санди Таймс" посвящает статью решению властей Непала убрать трупы альпинистов с горы Эверест. По мнению непальцев, тела погибших угрожают окружающей среде. Непальцы и ранее предпринимали попытки очистить Эверест от трупов. Установившаяся же в этом году очень мягкая погода позволит им подняться выше обычного и убрать большинство из 130 тел, до сих пор находящихся на склонах горы. Многие из трупов, лежащие прямо на пути подъема, даже играют роль мрачных знаков того, что альпинисты не сбились с пути. Один же из неудачников продолжает висеть на веревке недалеко от вершины горы. Хотя решение непальских властей, как отмечает газета, имеет под собой серьезные основания, родственники погибших альпинистов выступили против него. По их мнению, альпинисты должны остаться там, где встретили свою смерть, там, где мечтали быть. А пока некоторые менее почтительные горовосходители берут кости погибших на Эвересте в качестве страшных трофеев покорителя самой высокой вершины Земли, пишет в заключение "Санди Таймс".

Российская Федерация

Ельцин образовал Государственную военную инспекцию, назначив ее руководителем Кокошина. Батурин покинул пост секретаря Совета обороны

Президент Борис Ельцин подписал Указ "О мерах по усилению государственного управления военным строительством в РФ". Согласно указу, президент освободил Юрия Батурина от обязанностей секретаря Совета обороны РФ.

Решением Б.Ельцина создана Государственная военная инспекция президента РФ. Документом установлено, что инспекцию возглавляет государственный военный инспектор РФ. Должность секретаря Совета обороны РФ упраздняется.

Этим же указом государственным военным инспектором РФ назначен 51-летний Андрей Кокошин, до этого занимавший должность первого заместителя министра обороны РФ и являвшийся членом Совета обороны. А.Кокошин освобожден от ранее занимаемой должности.

Как сообщили журналистам в Администрации президента, "Ю.Батурин остается помощником главы государства, и в ближайшие дни, возможно, Б.Ельцин определит сферу его деятельности".

48-летний Ю.Батурин занимал пост секретаря Совета обороны с того момента, как этот орган был основан указом президента РФ 25 июля 1996 года.

Распродажа в сентябре
ISOVER СТРОИТЕЛЬНАЯ ТЕПЛОИЗОЛЯЦИЯ — КТ-11-50-$ 22(рулон) Не горит, удобна в работе, отличная звукоизоляция, безопасна для здоровья.
потолок подвесной в сборе РОР-20-$14м2
AKUSTO ПОДВЕСНЫЕ ПОТОЛКИ — 5 форм кромки, более 1000цветов, простота монтажа, влагостойкие, моющаяся поверхность, отличная звукоизоляция, представительный внешний вид.
ISOTEC ТЕХНИЧЕСКАЯ ТЕПЛОИЗОЛЯЦИЯ — Трубопроводов, теплотрасс, вентиляционных систем, дым.каналов, резервуаров, котлов, турбин, конденсатоизоляция, звукоизоляция.
Сертификат РБ, поставки со склада, скидки.
Словочка г.Заславль, ул. Путейко,5 тел.: (017) 294-21-98, 294-11-62
ООО МеталлПрофиль г. Минск, ул. Малинина, 36 тел. (017) 247-24-67

Все для САНТЕХМОНТАЖНЫХ работ
- Полный ассортимент трубопроводной арматуры (вентили шаровые, краны, фильтры, задвижки, клапаны и др.) гибкая подводка, сифоны,
RAVANI (Италия)
-Трубы канализационные и фасонные части к ним из ПВХ Ø110Ø50
wavin (Голландия)
- Фитинги оцинкованные
- Бытовая сантехника,
Словочка СТРОЙМАТЕРИАЛЫ г. Заславль, ул. Путейко 5 т./факс (0172) 942-198, (0172) 941-162

ЗАО "БЕЛАРОСИЧ" РЕАЛИЗУЕТ
МЕТАЛЛОПРОКАТ
Со склада в Минске:
труба катанная: 48х10; 57х4; 76х4; 89х4; 102х4; 108х4-5; 127х5; 133х5; 159х5-6; 219х8; 325х4,5 — 18,5 млн. руб.
труба в/г: ду 20, 25, 32, 50, 76х4 — 18,2 млн. руб.
швеллер № 16, 24 — 12,2 млн. руб.
полосы Ст.3-35Х 35х12; 40х25; 80х10; 100х10; 100х14; 105х7; 110х15; 120х16; 150х8; 150х12; 200х10 — 11,6 млн. руб.
квадрат 32х32 Ст. ШХ15 — 11,6 млн. руб.
Со склада в Гомеле:
уголок: 50, 63, 90
трубы катанные: 57х4, 76х4, 89х4, 102х4, 108х4, 127х5, 133х5, 159,6
полоса 25х4 и др. полосы
лист х/к 1,5 мм
швеллер № 10,16, 24
Тел./факс в Минске:(017) 278-49-83, 278-49-96
Тел./факс в Гомеле:(0232) 3-43-45

Балтия

Президенты Латвии, Литвы и Эстонии, возможно, проведут в Вильнюсе встречи с премьером РФ

Президенты Латвии, Литвы и Эстонии Гунтис Улманис, Альгирдас Бразаускас и Леннарт Мери, возможно, встретятся в рамках международной конференции в Вильнюсе с премьер-министром России Виктором Черномырдиным.

В столице Литвы 5—6 сентября пройдет конференция глав государств и правительств 13 европейских стран на тему "Сосуществование народов и добрососедские отношения — залог европейской безопасности и стабильности". В.Черномырдин будет представлять на форуме Россию.

Как сообщила "Интерфаксу" пресс-секретарь президента Латвии Лига Крапане, Рига получила по дипломатическим каналам из Вильнюса информацию о том, что российский премьер выразил желание встретиться в Вильнюсе не только с президентом Литвы Альгирдасом Бразаускасом как с представителем принимающей страны, но и с президентами Латвии и Эстонии.

Руководство Латвии рассматривает возможность увеличения оборонных расходов

Президент и премьер-министр Латвии Гунтис Улманис и Гунтарс Крастс обсудили возможность увеличения бюджетных ассигнований на нужды обороны, сообщили "Интерфаксу" в канцелярии латвийского президента.

Необходимость этого шага диктуется стремлением Латвии вступить в НАТО. Согласно критериям Североатлантического альянса, ассигнования на нужды обороны в государствах НАТО должны составлять не менее одного процента от общих бюджетных расходов.

В то же время государственный бюджет Латвии на 1997 год предусматривает ассигнования на оборону в размере лишь 0,6% от общих бюджетных расходов.

Узбекистан

Ислам Каримов обещает, что образование в республике по-прежнему будет бесплатным

